Радыё Свабода

ПАЛІТЫКА

Аўтамабілі, цеплавізары, маскавальныя сеткі. Хто ў Беларусі зьбірае дапамогу для расейскіх вайскоўцаў

12 лютy 2024, 09:00

Радыё Свабода

У зборах на патрэбы расейскай арміі і акупаваных Расеяй тэрыторый Украіны ў Беларусі ўдзельнічаюць ня толькі расейскія арганізацыі.

Поўнамаштабнае ўварваньне Расеі ва Ўкраіну пачалося амаль два гады таму. За гэты час у Расеі паўстала буйная сетка грамадзкіх арганізацый, якія розным чынам дапамагаюць расейскім вайскоўцам весьці баявыя дзеяньні на ўкраінскай тэрыторыі. Задзейнічаныя ў такой валянтэрскай дапамозе і некаторыя беларускія структуры. Расказваем пра іх падрабязьней.

1. Сьвята-Елізавецінскі манастыр (СЕМ)

Праваслаўны манастыр пад Менскам адкрыта падтрымлівае Z-прапаганду і расейскі бок у вайне з Украінай.

У 2023 годзе манастыр цалкам або часткова аплаціў **11 аўтамабіляў**, «буханак» і «легкавікоў» (УАЗ, ВАЗ, «Ніва») для расейскіх вайскоўцаў, якія датычныя да акупацыі тэрыторый Украіны. Таксама ў манастыры зьбіраюць **грошы на рыштунак** для іх. Некалькі расьсьледаваньняў гэтай дапамогі рабіў праект «Стопсем». Атрымліваецца, у сярэднім манастыр аплачваў адзін аўтамабіль для вайны за месяц.

Дапамога аўтапаркам ідзе праз расейскую манашку **Яўгенію Цыўцывадзэ**, якая кіруе расейскай групай валянтэраў «Помощь братьям». Яна прыяжджала разам з расейскім камандзірам у менскі манастыр 10 сьнежня 2023 году. Расейскія вайскоўцы дзякавалі беларускім манашкам за **цеплавізары, навушнікі, вайсковую форму, ежу, лісты**. Манашка Яўгенія рэгулярна расказвае пра гуманітарную дапамогу расейскім вайскоўцам у сваёй групе «„Помощь братьям“ и мать Евгения» і прыкладае фота скрыняў, напэўна, зь неабходнымі рэчамі.

У верасьні 2023 году кіраўнік расейскай акупацыйнай улады так званай «ДНР» **Дзяніс Пушылін** узнагародзіў манастыр граматай на знак удзячнасьці за дапамогу і падтрымку.

Дапамогу манашак расейцам на фронце ўхваліў **Аляксандар Лукашэнка**. У пачатку 2023 году ён наведаў манастыр.

ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:
«Яны зарабляюць на ўсім». Як менскі Сьвята-Лізавецінскі манастыр стаў вялізнай бізнэс-імпэрыяй і асяродкам «русского мира»

> «Вы ўсё робіце слушна. Не зьвяртайце ўвагі на дзясятак-другі праплачаных людзей. Мы ня толькі дапамагаем нашым рускім братам, расейцам, я гэта ніколі не хаваў. І ўчорашні мой візыт да вайскоўцаў, да расейскіх вайскоўцаў, сьведчыць пра тое, што мы падтрымлівалі і падтрымліваем нашых братоў», — сказаў Лукашэнка.

На фэстывалі «Радасьць», прымеркаваным да Раства, у канцы 2023 году ў цэнтры «Ковчег» праваслаўнага манастыра плялі **маскавальныя сеткі** для расейскіх вайскоўцаў, пісала «Хрысьцінская візія».

Сёлета ў пачатку году Сьвята-Елізавецінскі манастыр перадаў **грошы нібыта на лячэньне 40 хворых дзяцей** у Горлаўцы Данецкай вобласьці Украіны. Сума невядомая.

ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:

У Сьвята-Елісавецінскім манастыры новы год пачалі з адпраўкі ў так званую «ДНР» ахвяраваньняў і дапамогі

За сваю падтрымку Расеі СЕМ страчвае рынкі ў Эўропе, дзе раней яны прадавалі рамесныя вырабы са сваіх майстэрняў. У Славакіі нядаўна адмянілі кірмаш Сьвята-Елізавецінскага манастыра, заплянаваны на 12 студзеня 2024 году, за тое, што «беларускія манашкі зарабляюць грошы для расейскіх салдатаў».

2. «Белая Русь»

Партыя «Белая Русь» абвясьціла вялікую кампанію па ўсёй Беларусі ў сьнежні 2023 году. Яны зьбіраюць гуманітарную дапамогу для акупаваных Расеяй тэрыторый Украіны. Акцыя называецца «„Белая Русь“ — дзецям Данбасу». У плянах сабраць 50 тон дапамогі. Большую частку яе ўжо меліся накіраваць на ўсход Украіны.

Са словаў старшыні партыі **Алега Раманава**, гэта пераважна **харч**, **сродкі гігіены**, таксама **мэдычныя рэчы (лекі, інвалідныя вазкі, мыліцы)**. Акцэнт — на дапамозе дзецям, якія жывуць на гэтых тэрыторыях. У партыі заяўляюць, што ім вязуць **цацкі** і **спартовы інвэнтар**. У акцыі, як кажа Раманаў, бралі ўдзел усе ахвотныя.

ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:

Праўладная «Белая Русь» адпраўляе больш за 50 тон нібы гуманітарнай дапамогі ў акупаваны Данбас, — расейскія СМІ

3. «Русский дом»

У зборы **гуманітарнай дапамогі «дзецям Данбасу» і «мірнаму насельніцтву Данбасу»** браў удзел таксама «Русский дом» у Менску, які называе сябе «расейскім цэнтрам навукі і культуры», пісалі праваабаронцы MayDay. Гэта праект расейскага агенцтва «Россотрудничество», які займаецца расейцамі за мяжой.

«Русский дом», як і «Белая Русь», супрацоўнічае з «Русской гуманитарной миссией» — ініцыятывай, якая дастаўляе дапамогу вайскоўцам на фронт, а таксама на акупаваныя тэрыторыі. «РГМ» адкрыла «Русский дом» у акупаваным Данецку.

Сёлета ў лютым філіял «Русского дома» у Берасьці ладзіць акцыю па зборы **прадуктаў харчаваньня і грошай для расейскіх вайскоўцаў**, піша MayDay. Дапамагаць збору будуць берасьцейскія **вэтэранскія арганізацыі**. Да «Дня абаронцаў Айчыны» «Русский дом» у Берасьці заклікае прыносіць ім у офіс **шакаляд, сала, кансэрвы, у тым ліку хатнія,** а таксама **грошы і паштоўкі зь віншаваньнямі**.

4. Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа

Улетку 2023 году генэральны сакратар Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа **Дзьмітры Шаўцоў** езьдзіў у вопратцы з нашыўкай «Z» на акупаваны Данбас і перадаў туды **гуманітарную дапамогу**.

Ён зьняўся ў рэпартажы тэлеканала «Беларусь-1», дзе прызнаўся, што яго арганізацыя бярэ ўдзел у вывазе дзяцей з Украіны. Пазьней міжнародны Чырвоны Крыж заявіў, што ня мае дачыненьня да паездкі кіраўніка беларускай філіі на акупаваны Данбас, а таксама выказаў заклапочанасьць і гатоўнасьць спыніць падобную дзейнасьць у будучыні. Шаўцоў застаўся на сваёй пасадзе, нягледзячы на заклікі зьняць яго. Але міжнароднае таварыства Чырвонага Крыжа прыпыніла сяброўства беларускай адзінкі ў сваёй структуры.

ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:
Кіраўнік Беларускага Чырвонага Крыжа Шаўцоў працягне працу, нягледзячы на

патрабаваньні Міжнароднай фэдэрацыі зьняць яго з пасады

5. Ігуменьня Гаўрыіла

Адыёзную прыхільніцу Аляксандра Лукашэнкі, якая асуджала пратэсты і насіла тарты амапаўцам, заўважылі ў дапамозе расейскім салдатам. Тэлеканал «Белсат» паведамляў пра выпадак, як людзі ў вайсковай форме з расейскімі знакамі адрозьненьня дзякуюць ігуменьні горадзенскага жаночага манастыра ў гонар Нараджэньня Багародзіцы Гаўрыіле за дапамогу.

«Дзякуем за гуманітарную дапамогу зь Беларусі ігуменьні жаночага манастыра матушцы Гаўрыіле, якая сабрала **гуманітарную дапамогу** і накіравала нам на „спэцыяльную ваенную апэрацыю“, аўдзееўскі кірунак», — сказаў адзін зь іх на відэа.

ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:
Асабісты кіроўца — кадэбіст, у сябрах памочнік Лукашэнкі. Хто такая матушка Гаўрыіла з Горадні